# Без аўкцыёну

## Прэзідэнт падпісаў указ, які робіць зямельныя адносіны больш дасканалымі

**Цяпер дзяржаўныя арганізацыі могуць атрымліваць зямельныя ўчасткі для будаўніцтва жылля без удзелу ва аўкцыёнах, паведамляе прэс-служба Прэзідэнта. Аб гэтым гаворыцца ва Указе № 485 «Аб удасканаленні зямельных адносін і разгляду зваротаў грамадзян і юрыдычных асоб», які Аляксандр Лукашэнка падпісаў 26 снежня.**

Камунальныя ўнітарныя прадпрыемствы па капітальным будаўніцтве і іншыя дзяржаўныя арганізацыі (з доляй дзяржавы больш за 50 %) атрымалі права ўзводзіць кварталы індывідуальнай забудовы на выдзеленых зямельных участках. Яны змогуць рабіць гэта як за кошт уласных рэсурсаў, так і з прыцягненнем грашовых сродкаў грамадзян, якія стаяць на ўліку для паляпшэння жыллёвых умоў.

Пры прыцягненні грашовых сродкаў грамадзян аднакватэрныя (блакаваныя) жылыя дамы будуць узводзіцца па заканадаўстве аб долевым будаўніцтве.

Указ спашчае працэдуру канфіскацыі і давання зямельных участкаў пры пераразмеркаванні (ратацыі) зямель паміж сельскагаспадарчай і лесагаспадарчай арганізацыямі. Праект адвядзення зямельнага ўчастка ў гэтых мэтах будуць распрацоўваць падраздзяленні землеўпарадкавання раённых выканкамаў. Пры гэтым выключана неабходнасць устанаўлення фіксаванай мяжы зямельнага ўчастка на мясцовасці.

У адпаведнасці з дакументам паведамленні аб правядзенні аўкцыёнаў па продажы дзяржаўнай маёмасці будуць размяшчацца на афіцыйных сайтах Дзяржаўнага камітэта па маёмасці, аблвыканкамаў і Мінскага гарвыканкама. Гэтая інфармацыя дадаткова павінна публікавацца ў друкаваных сродках масавай інфармацыі, вызначаных урадам, аблвыканкамамі і Мінскім гарвыканкамам.

Таксама ва ўказе пералічаны дзяржаўныя органы і іншыя арганізацыі, якія адказваюць за разгляд зваротаў па сутнасці ў асобных сферах жыццядзейнасці насельніцтва. Мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы ўпаўнаважаны разглядаць шэраг актуальных катэгорый зваротаў: аб дзейнасці гаражна-будаўнічых, дачных кааператываў, садаводчых таварыстваў, а таксама антыкрызісных кіраўнікоў (сумесна з Міністэрствам эканомікі).

# 30 законаў на новы год

**Прэзідэнт падпісаў Указ № 482, якім зацверджаны план падрыхтоўкі законапраектаў на 2020 год. Пра гэта паведамляе БелТА са спасылкай на прэс-службу беларускага лідара.**

У 2020 годзе плануецца падрыхтаваць 30 праектаў законаў. У іх ліку як прынцыпова новыя законы (напрыклад, праекты законаў «Аб узносах у бюджэт дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Рэспублікі Беларусь», «Аб дзяржаўнай рэгістрацыі і ліквідацыі (спыненні дзейнасці) суб'ектаў гаспадарання», «Аб арганізацыях, якія самарэгулююцца», «Аб ліцэнзаванні»,»Аб валанцёрскай дзейнасці»), так і накіраваныя на сістэмную актуалізацыю дзеючых законаў, у тым ліку з улікам практыкі іх прымянення.

У 2020 годзе таксама запланавана распрацоўка канцэпцый законаў «Аб страхавой дзейнасці», «Аб аб'яднаннях наймальнікаў», «Аб доступе да інфармацыі аб дзейнасці судоў агульнай юрысдыкцыі», «Аб інфармацыі, інфарматызацыі і абароне інфармацыі».

# ДЗЕЛЯ ІХ ШЧАСЛІВАЙ БУДУЧЫНІ


Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Ужо чвэрць стагоддзя ў Беларусі праводзіцца дабрачынны марафон «Нашы дзеці». Кіраўнік дзяржавы падзякаваў усім, хто падтрымаў гэтую ініцыятыву, адгукнуўся на яго заклік.

«Для мяне як Прэзідэнта вельмі важна зрабіць усё магчымае, каб у жыццё кожнага з вас, кожнага нашага дзіцяці прыйшло чараўніцтва ў выглядзе шчырага клопату, душэўнага цяпла, нечаканых падарункаў і прыемных сустрэч з добрымі і спагаднымі людзьмі. Менавіта такім павінна быць наша свята», — звярнуўся да юных гасцей Аляксандр Лукашэнка.

Ён адзначыў, што, згодна з традыцыямі, у беларусаў ніколі не было, няма і не можа быць чужых дзяцей.

«Кіруючыся заклікам сэрца, мы заўсёды гатовыя прыняць удзел у лёсах маленькіх грамадзян іншых дзяржаў. Мы ўсё-такі худа-бедна жывём пад мірным небам, у спакойнай, ціхай і прыгожай краіне. Але далёка не ўсюды так. І мы як сапраўдныя высакародныя людзі, як сапраўдныя беларусы дапамагаем гэтым дзецям. Да нас на аздараўленне прыязджаюць дзеці з розных куткоў планеты. Напрыклад, Японіі, Кітая, Сірыі. У рэспубліканскім цэнтры «Зубраня» пабывалі дзеці з больш чым 40 краін свету, — паведаміў Прэзідэнт і дадаў: — Гэта малое, што мы можам зрабіць для таго, каб усе дзеці Зямлі ведалі: яны патрэбныя. І мы, дарослыя, у сваёй большасці жывём і працуем дзеля шчаслівай будучыні гэтых дзяцей».

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што верыць: у будучыні прысутныя ў зале гледачы стануць добрымі людзьмі, якія зробяць для сваёй краіны нешта важнае і карыснае. У доказ — іх шматлікія дыпломы прадметных алімпіяд, перамогі на музычных і мастацкіх конкурсах, медалі ў спорце.

«Я шчыра ганаруся ўсімі вашымі поспехамі. Думаю, што такіх поспехаў стане яшчэ больш, калі мы адкрыем Нацыянальны дзіцячы тэхнапарк для самых адораных і юных беларусаў. З усіх куткоў нашай краіны, нашай радзімы туды будуць мець магчымасць прыехаць нашы дзеці. Пропуск адзіны — вашы веды і талент», — падкрэсліў ён, папрасіўшы маленькіх беларусаў шанаваць блізкіх людзей, паважаць настаўнікаў.

> **«Для мяне як Прэзідэнта вельмі важна зрабіць усё магчымае, каб у жыццё кожнага з вас, кожнага нашага дзіцяці прыйшло чараўніцтва ў выглядзе шчырага клопату, душэўнага цяпла, нечаканых падарункаў і прыемных сустрэч з добрымі і спагаднымі людзьмі. Менавіта такім павінна быць наша свята».**

У канцы казачнага прадстаўлення дзеці таксама ўручылі Прэзідэнту свае падарункі — пано «Калядны анёл» і кампазіцыю «Музыка гучыць».

У Палацы Рэспублікі ўчора сабралася амаль 2400 дзяцей з усіх куткоў краіны. Некаторыя з іх здзейснілі ў сваім жыцці значныя дасягненні ў творчых конкурсах, рэспубліканскіх і міжнародных алімпіядах, спартыўных спаборніцтвах, грамадзянскай рабоце. Былі і тыя, хто спазнаў самыя значныя страты: дзеці-сіроты, дзеці, якія засталіся без апекі бацькоў. Сярод гасцей свята і навучэнцы Вільнюскай гімназіі імя Францыска Скарыны, Рыжскай беларускай асноўнай школы.

**Марыя ДАДАЛКА.**

# Свята з душэўнай цеплынёй

**Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА, старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу, учора ў рамках акцыі «Нашы дзеці» наведаў Бягомльскую дапаможную школу-інтэрнат Докшыцкага раёна. Установе падарыў камп'ютар, а кожнаму выхаванцу — па салодкім падарунку.**


Фота БелТА.

У гэтай школе, што ў гарадскім пасёлку Бягомль, сёння жыве больш за сто дзяцей з асаблівасцямі развіцця ва ўзросце ад 7 да 17 гадоў.

Уладзімір Андрэйчанка, віншуючы дзяцей і работнікаў інтэрната, адзначыў, што яму вельмі прыемна тут быць напярэдадні навагодняга свята, і гэта ўжо шматгадовая традыцыя.

Народны выбраннік звярнуў увагу, што ў школе-інтэрнаце штогод адбываюцца значныя змены ў лепшы бок — як і ва ўсім гарадскім пасёлку, дзе становіцца ўсё больш утульна. Тут актыўна вядзецца добраўпарадкаванне вуліц і двароў, прыведзены ў парадак многія аб'екты сацыяльна-культурнага прызначэння. І гэта ўсё робіцца дзеля дзятвы і дарослых, якія жывуць у населеным пункце.

Віншуючы выхаванцаў і ўвесь калектыў школы, Уладзімір Андрэйчанка падкрэсліў, што навагодняе свята асаблівае, а, калі верыць у цуды, яны збываюцца. Ён адзначыў, што ў краіне ёсць усё магчымае для самарэалізацыі, набыцця прафесіі, атрымання годнай работы. Спікер парламента пажадаў, каб усе мары рэалізаваліся ў наступным годзе.

— Каб дасягнуць таго, што запланавалі, пра што марыце, канешне, трэба добра вучыцца, старацца ў першую чаргу для сябе, — падкрэсліў ён.

Старшыня Докшыцкага раённага выканаўчага камітэта Алег Пінчук падзякаваў педагогам і выхавацелям школы-інтэрната за тое, што не шкадуючы аддаюць хлопчыкам і дзяўчынкам душэўную цеплыню. Ад райвыканкама ён перадаў у падарунак тэлевізар.

Свае салодкія падарункі дзецям таксама ўручылі прадстаўнікі ААТ «Ашчадны банк «Беларусбанк» — шэфа інтэрната. А ўстанове адукацыі — пральную машыну і пыласосы...

Дзеці паказалі гасцям святочнае прадстаўленне. І выказалі надзею, што ўбачацца зноў.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# Дзіцячаму дому — фізіятэрапеўтычны кабінет

**Міністр абароны генерал-лейтэнант Андрэй Раўкоў наведаў Андрэеўскі дзіцячы дом у Аршанскім раёне. Ён завітаў на падрыхтаваны выхаванцамі «Навагодні аганёк» і ўручыў дзецям падарункі. Самым галоўным з іх стаў цэлы фізіятэрапеўтычны кабінет.**



— Мы традыцыйна прыязджаем у навагоднія дні павіншаваць выхаванцаў Андрэеўскага дзіцячага дома. І стараемся падчас усяго года рабіць карыснае для іх, — кажа Андрэй Раўкоў. — Акрамя фізіятэрапеўтычнага кабінета, мы падарылі дзецям канструктары, каб яны маглі развівацца. Наша галоўная задача — зрабіць усё, каб дзеці, з якімі нядобра абышоўся лёс, не адчувалі сябе абдзеленымі, каб яны сталі годнымі грамадзянамі сваёй краіны і радавалі нас сваімі поспехамі.

За апошнія 10 гадоў вайскоўцы шмат у чым дапамаглі дзіцячаму дому. Быў уцеплены фасад, спартыўная, трэнажорная і актавая залы атрымалі сучасны рамонт і абсталяванне, з'явіўся камп'ютарны клас, запрацаваў інтэрактыўны цір.

Святочную музычную праграму падрыхтавалі артысты Акадэмічнага ансамбля песні і танца Узброеных Сіл і дзіцячай студыі «Зорачка». Дзеці ж падарылі Андрэю Раўкову цацачных мышанят.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

**Фота прадстаўлена Міністэрствам абароны.**